Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 04/12/2025 23:33:48

DOI:10.17951/sb.2021.15.133-151
Studia Białorutenistyczne 15/2021 HISTORY, CULTURE AND SOCIOLOGY
ISSN: 1898-0457 e-ISSN: 2449-8270 Licence: CC BY 4.0

Tatsiana Valodzina / Таццяна Валодзіна

Center for Belarusian Culture, Language and Literature Research National Academy of Sciences, Minsk (Belarus)
e-mail: tanja_volodina@tut.by
https://orcid.org/ 0000-0002-9800-2199

# Беларускія і польскія замовы: ад паралеляў да агульнай сюжэтна-матыўнай прасторы

*Belarusian And Polish Spells: From Parallels to a Common Plot-Motive Space*

*Białoruskie i polskie zamowy: od paraleli do wspólnej przestrzeni fabularnej*

**Abstract**

Spells from the western territories are an organic part of the folk magic compendium of Belarus, which are included in the general ethnic piggy bank with the main and frequent plots, motifs and images, but at the level of priorities and development of individual elements they make up a slightly different and at the same time complete picture. There are a lot of formulas, images, and motifs that continue the Polish spell tradition and then „dissipate", point-by-point fixed in places of compact residence of the Catholic population. At the same time, several motifs and even complexes associated with individual functional spell groups fall out of the border zone. The Polish folk magic tradition has become a kind of conductor of Western European influences for Belarusian ones, while direct borrowings from Polish texts are rare. In general, comparative studies give grounds to express the idea of the existence of a common Western Belarusian-Polish plot and motif spell space.

**Keywords:** Belarusian and Polish folklore, spells, folk medicine, plot and motive, comparative studies

**Abstrakt**

Krótkie słowne zaklęcia zwane zamowami stanowią integralną część folkloru zachodniej Białorusi. Cechuje je bogactwo linii fabularnych, motywów i wątków obecnych od dawna w białoruskiej kulturze ludowej. Jednak hierarchia poszczególnych składowych oraz ich zbadanie

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 04/12/2025 23:33:48



wykazują obraz nieco niejednorodny, mimo że stanowią pewną całość. W niniejszym artykule poddano analizie pochodzące z folkloru polskiego formuły, postacie, motywy ludowe, które są rozrzucone w otoczeniu białoruskim i które nadal notujemy w osobnych punktach w regionach zamieszkanych przez ludność wyznania katolickiego. Jednocześnie niektóre motywy oraz ich zespoły funkcjonujące w zamowach na pograniczu nie występują. Poprzez polską tradycję zaklęć słownych do białoruskiej przedostały się elementy zachodnioeuropejskie, tymczasem bezpośrednie zapożyczenia z folkloru polskiego należą do rzadkości. Przeprowadzone studium porównawcze dowodzi tezy o istnieniu wspólnej polsko-białoruskiej przestrzeni fabularnej zamów i zaklęć ludowych.

**Słowa kluczowe**: białoruski i polski folklor, zamowy, medycyna ludowa, fabuła i motyw, studium porównawcze

**Анатацыя**

Замовы з заходніх тэрыторый – арганічная частка замоўна-заклінальнага кампендыума Беларусі, асноўнымі і частотнымі сюжэтамі, матывамі і вобразамі ўваходзяць у агульнаэтнічную скарбонку, аднак на ўзроўні прыярытэтаў і распрацаванасці асобных элементаў складаюць некалькі адрозную і ў той жа час цэласную карціну. Выяўляецца шэраг формулаў, вобразаў, матываў, якія працягваюць польскую замоўную традыцыю і далей „рассейваюцца", кропкава фіксуюцца ў месцах кампактнага пражывання каталіцкага насельніцтва. У той жа час некалькі матываў і нават комплексаў, звязаных з асобнымі функцыянальнымі замоўнымі групамі, выпадае з зоны памежжа. Польская замоўная традыцыя стала для беларускай своеасаблівым праваднікам заходнееўрапейскіх уплываў, у той час як прамыя запазычанні з польскіх тэкстаў рэдкія. У цэлым параўнальныя штудыі даюць падставы выказваць думку аб існаванні агульнай заходнебеларуска-польскай сюжэтна-матыўнай замоўнай прасторы.

**Ключавыя словы**: беларускі і польскі фальклор, замовы, народная медыцына, сюжэт і матыў, параўнальныя штудыі

## Уводзіны

Беларуская замоўна-заклінальная традыцыя адносіцца да ліку жывых, актуальных і сёння. Назапашаны за апошнія тры стагоддзі матэрыял сведчыць аб яе амаль выключна вусным характары, што ў сваю чаргу абумовіла шырокую варыятыўнасць і шматстайнасць сюжэтаў, матываў, вобразаў. На тэрыторыі рассялення беларусаў між тым замоўная карціна досыць неаднародная, адрозненні пачынаюцца ўжо з колькаснай прадстаўленасці і працягваюцца на ўзроўні тэматыкі і міфапаэтыкі. Колькасць замоў, зафіксаваных на паўднёвым усходзе краіны, перавышае колькасць замоў з паўночнага захаду больш як у сто разоў. Меркаваць, што заходнім раёнам Беларусі не пашанцавала на свайго зацікаўленага збіральніка XIX ст., не даводзіцца, бо на тэрыторыі сённяшніх Воранаўскага, Слонімскага раёнаў працаваў такі апантаны этнограф, як Міхал

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 04/12/2025 23:33:48



Федароўскі. Аднак у яго капітальным зборы беларускага фальклору толькі некалькі ўзораў вербальнай магічнай медыцыны (Federowski, 1897). Друкаваных замоў з Гродзеншчыны прадстаўлена мізэрна мала, парадку трох-чатырох дзесяткаў тэкстаў.

Аднак і зварот да суседняй польскай традыцыі выяўляе падобную сітуацыю. Не вылучаецца колькасна назапашаная на сёння калекцыя польскіх замоў, прадстаўленая ў зборах Оскара Кольберга, Францішка Катулі, Уладзіслава Сяркоўскага, Макса Топпена, у шэрагу публікацый у часопісах „Wisła", „Zbiór Wiadomości do Antropologii Krajowej", „Lud" і інш. прааналізаваная Станіславай Небжэгоўскай-Бартміньскай (Niebrzegowska-Bartmińska, 2005, 2007), Мажэнай Марчэўскай (Marczewska, 2012), Вольгай Вахцінскай[1] (Wachcińska, 2013) і інш. Юліян Крыжаноўскі ўслед за Казімірам Машыньскім заўважае, што замовы ў польскай народнай медыцыне менш частыя і менш выразныя, чым у рускай (Krzyżanowski, 1965, 460-461). Варта мець на ўвазе, што даследчыкі заходнеславянскіх вербальных магічных практык адасабляюць замову і народную малітву, хоць і канстатуюць іх генетычную сувязь. Але менавіта для польскай тэрыторыі ўласціва асаблівая распрацаванасць народных малітвачак, стылем і вобразнасцю блізкіх як да замоў, так да малітваў і нават да духоўных вершаў. У польскай фальклярыстыцы да гэтага разраду адносяць перш за ўсё тэксты індывідуальна-абарончага прызначэння, самая яркая сярод іх апакрыфічная малітва „Божай Маці сон" (Brzozowska-Krajka, 1995; Zowczak, 2004; Zowczak 2013). Даная тэрміналагічная неаднароднасць гэтаксама ўплывае на колькасную ацэнку польскай вербальнай магіі.

Усебаковае даследаванне ролі і функцый менавіта вербальнага лекавання на беларуска-польскім памежжы яшчэ чакае свайго даследчыка. Пакуль відавочна тое, што важкім грунтам рэдукаванасці гэтай сферы традыцыйнай культуры выступае моцная пазіцыя каталіцкага касцёлу, які мае найбольшы ўплыў менавіта ў заходніх рэгіёнах Беларусі, катэгарычнае адмаўленне з боку святароў і значнай часткі вернікаў у лекаванні магічным словам. Мае значэнне і ўнутрыкультурны фактар закрытасці/адкрытасці традыцыі, калі ў свядомасці лекара закладзена ўстаноўка, згодна з якой перадача замовы прывядзе да змяншэння ці страты яго магічнай моцы. Такая закрытасць натуральным чынам паўплывала на невысокі працэнт запісу тэкстаў у часе экспедыцый, пры тым што рытуальны складнік народнай медыцыны ў Заходняй Беларусі вельмі распрацаваны і „адкрыты" для назіральніка.

На фоне агульнабеларускім замовы з заходніх тэрыторый складаюць яго арганічную частку, асноўнымі і частотнымі сюжэтамі, матывамі і вобразамі ўваходзяць у агульнаэтнічную скарбонку, аднак на ўзроўні прыярытэтаў

[1] Аўтарка ў сваю кнігу без усялякіх агаворак уключыла і апісанні беларускай і ўкраінскай народнай медыцыны, адно на падставе іх прадстаўленасці на польскай мове, хоць арыгінальныя тэксты замоў там падаюцца з захаваннем дыялектных асаблівасцяў.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 04/12/2025 23:33:48



і распрацаванасці асобных элементаў утвараюць некалькі адрозную і ў той жа час цэласную карціну. Даволі неаднародная дыялектная палітра беларускіх замоў суседнічае з польскай, дзе наяўны на сёння матэрыял гэтаксама сведчыць аб шэрагу разыходжанняў між тэкстамі з розных этнаграфічных зонаў, якія, у сваю чаргу, сталі чуйнымі да ўплываў з суседніх тэрыторый. Прыкладам, выразна вылучаецца ўсходнепольская тэрыторыя пражывання праваслаўных з некалькі адрозным рэпертуарам, а замоўны кампендыум з польскага Памор'я выяўляе мноства перасячэнняў з паўночнанямецкімі тэкстамі[2].

Як беларуская, так і польская замоўныя традыцыі ўжо неаднаразова разглядаліся з розных даследчых ракурсаў, хоць пашырэнне факталагічнага матэрыялу непазбежна ўносіла карэктывы ў атрыманыя высновы. Аднак да сёння яшчэ няма рэестру матываў польскіх замоў, не апісана і заходнебеларуская традыцыя. Дадзенае даследаванне ставіць на мэце не столькі параўнаць сюжэтна-матыўны склад беларускіх і польскіх замоў, колькі паставіць пытанні аб польскай традыцыі як крыніцы запазычанняў або транзіту з германскіх замоўных комплексаў, або канстатаваць агульную замоўную польска-заходнебеларускую прастору. Франтальны агляд як беларускіх, так і польскіх замоў выяўляе шэраг падабенстваў, які вымагае скрупулёзнай праверкі наяўнасці падобных матываў, формул, сюжэтных сітуацый у суседніх сістэмах, у літоўцаў і латышоў, у заходняй Украіне, чэхаў і асабліва ў немцаў. Толькі валоданне максімальна шырокім корпусам тэкстаў дазваляе рабіць высновы арэальнага характару. Першай прыступкай да такога роду даследавання і становіцца гэты артыкул.

Яшчэ адно пытанне, вырашэнне якога мае пэўную актуальнасць, – суадносіны этнічнага і канфесійнага ў польскамоўных тэкстах, што бытуюць сярод беларусаў-католікаў, прычым зусім не абавязкова на памежжы. Маркёр польскага на тэкстах тым не менш не выключае прыналежнасць гэтых замоў і да агульнабеларускай карціны.

Адзін з паказнікаў для параўнання тычыцца тэматычнай разнастайнасці, бо, нягледзячы на падабенства ў геаграфічна-кліматычных ўмовах, блізкасць міфалагічных сістэм уласна рэестр захворванняў і іншых сітуацый звароту да замоўных практык на тэрыторыі Заходняй Беларусі (і Беларусі ў цэлым) і Польшчы выяўляе шэраг адрозненняў. Такія часта і паўсюдна вядомыя захворванні, як боль спіны ці суставаў, грыжа, запаленні скуры, праблемы ў страваванні і інш. у самастойныя комплексы ўвасобіліся толькі на абмежаваных тэрыторыях. З іншага боку, адна і тая ж немач у розных рэгіёнах атрымлівае дыялектныя найменні, матываваныя рознымі праявамі сімптаматычнага ці этыялагічнага характару.

2 Замовы з Памор'я добра дакуметаваныя ў працах Топпена, як на польскай, так і на нямецкай мовах.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 04/12/2025 23:33:48



## Да пытання ранніх фіксацый замоўных тэкстаў

Датычна беларускай замоўнай традыцыі з вялікай доляй перакананасці можна канстатаваць яе вусны характар. Тэкстаў замоў у ранніх друкаваных крыніцах выяўлена мала[3], лакалізацыя стварэння рукапісу „Книга глаголемая лечебник Литовскій" няпэўная, хоць і маюцца падставы суадносіць яе менавіта з этнічнай тэрыторыяй беларусаў. У польскай традыцыі найбольш ранні выпадкі фіксавання замоў адносяцца да XV стагоддзя. Аляксандр Брукнер выявіў і надрукаваў тры фрагменты з замоў канца XV ці пачатку XVI ст. з рукапісаў бібліятэкі ў Пецярбургу (sygn. Łać. I. Octavo nr 73). Першы з іх «Zarze, zarzyce trzy szyestrzyce...» (Brückner, 1895, s. 332) надзвычай папулярны ў беларусаў, прычым як фрагментамі *зара-зарыца*, *зарыцы-сястрыцы*, так і іх колькаснай характарыстыкай. Да прыкладу: *Зара-зарыца, мілая сястрыца. У мяне Анютка, а ў цябе* (любое імя ад Бога берыш). *Давай іх пажэнім, няхай яны салодкім сном спяць*[4].

Наступны фрагмент, які апавядае пра сустрэчу на моры Божай Маці са святым Янам і іх размову – *Poszla mathka bozą po morzw szbyrayacz zlothe pyanky podkal yą szwanthy yan a gdze gydzesz mathwchno. ydą szynaczka swego leczycz* (Brückner, 1895, s. 22) – гэтаксама нярэдкі ў беларусаў:

> Ішоў Ян Злотоус чэрэз золоты мост, золотой кульбочкой опыраўся, з Найсвеншонькою Маценкою поўстрычаўса. Пытаецца Ян Золотоус: – Куды ідэш, Прэчыста Божа Маты? – Іду порушэнне вымоўляты (імя) з жылочок, з косточок, з чырвоной крыві, жоўтой кості…[5].

У 2017 годзе Марыюш Леньчук дадае яшчэ дзве польскія замовы з XV ст., адшуканыя ў рукапісу дамініканцаў з Кракава. Адна з іх скарыстоўвалася супраць змяінага ўкусу: „Wierzę Boga". Potym, *jestliż jest gad albo gadzica, sztir albo szczyrzyca, jaszczor albo jaszczorka, źmij[a] albo źmijica, przykazuję tobie bożąż mocą, aby temu to bożemu stworzeniu nic aby nie szkodziło. A ma mianować ten, rzec mianem, kogo by tenci robak uszczypnął: In nomine Patris et Filii et Spiritus Sancti. Amen* (Leńczuk, 2017, s. 221). Аўтар актыўна шукае паралелі хутчэй на захадзе (прыкладам, лічыць, што лексема *gadzica* магла б быць запазычанай з чэшскай ці нават нямецкай мовы) (Leńczuk, 2017, s. 224), між тым у беларусаў да апошняга часу фіксуюцца вельмі блізкія тэксты. На Гродзеншчыне гэта

---

3 Што не выключае пісьмовых фіксацый у цэлым. На сёння адмысловыя мэтаскіраваныя пошукі проста не праводзіліся.

4 Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (АІМЭФ): зап. у 1990 г. Валодзіна Т. у в. Завідзічы Лепельскага р-на ад Казлоўскай М.С., 1924 г.н. Пашпарт запісу падаецца з прынятай у беларускай фалькларыстыцы практыкай. Тут і далей адсутныя кавалкі тэксту не пазначаюцца.

5 Зап. І. Мазюк у в. Машковічы Бярозаўскага р-на Брэсцкай вобл. ад Алены Пятроўны, 1919 г.н. (асабісты архіў збіральніка).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 04/12/2025 23:33:48



кароткія заклінанні, прычым не абавязкова ад укусу змяі, што можа ўскосна сведчыць аб міжфункцыянальнасці і самастойнай семантычнай нагрузцы такога парнага пераліку носьбітаў небяспекі: *Замаўляю ад вужа, ад вужыцы, ад гада, ад гадзіцы. Каму завiсць, каб не пайшло ў карысць. Дзяркач у зубы, галкі ў пяты, каб не дайшоў дахаты*[6]*; Ci wąż, ci wążуса, ci zmiej, ci zmiaica. Niech krew stanie, jak wona była w młodości, niech stanie w tej smutniej nieszczęsności* (Balkuce, 2020, s. 369, Воран.). На ўсходзе краіны, як правіла, такія пералікі патэнцыйных носьбітаў небяспекі падрабязныя і ўваходзяць у вялікія па аб’ёму тэксты:

> Устану я рана, памыюся бела-румяна, выйду на чыстая поля, гляну на сіняе моря, на сінім морі стаіць дуб на дзвінаццаць какатоў, на дзвінаццаць карянёў. На том дубі змяя Настасся і *вуж-вужыца, курап-курапіца і яшчур-яшчарыца і слівень-слівяніца і казяў-казявіца*. Сабірайця сваіх людзей, сабірайця сваіх дзяцей, сабірайця і ўгаварівайця. Ня будзеце сабіраць, ня будзеце ўгаваріваць, прішлець Гасподзь Бог Міколу на сівум коню, мечам будзець головы адсекаць, на запад сонца адкідаць. Плавала па сініму морю макавае зяренечка, стань жа ты ў (імя) лягчэй макавага зяренечка і ў жылах, і ў пажылах. Амінь[7].

Такім чынам, раннія фіксацыі польскіх замоў паказваюць на выразную сюжэтна-матыўную агульнасць іх з беларускімі запісамі апошняга стагоддзя, што не выключае існавання агульнай прасторы ў мінулым.

## Беларускія і польскія замовы ў еўрапейскай перспектыве

Відавочна, што вялікі пласт сюжэтаў, матываў у розных рэгіёнах Еўропы выяўляе значную ступень падабенства, заснаваную ў першую чаргу на ўніверсальных уяўленнях пра прычыны хваробаў і метады ад іх пазбаўлення. Кожная этнічная калекцыя поўніцца стратэгіямі па выгнанні хваробы, ачышчэнні ад яе, просьбамі аб ацаленні да персанажаў розных роўняў і інш. Іншая справа, пры захаванні схемаў адрозніваюцца фармальныя ўвасабленні, дэталі міфапаэтыкі і вобразнасці. Нароўні з мясцовай творчасцю назіраецца і моцная тэндэнцыя да запазычанняў, прычым рознай часавай глыбіні. Побач з перанятымі элементамі яшчэ з часоў распаўсюджання хрысціянства існуюць больш позні запазычаныя формулы, а сённяшняя карціна наогул характарызуецца перамяшаннем мясцовых рысаў з узятымі з самых розных крыніц, асабліва ў інтэрнэт-прасторы.

6 АІМЭФ: зап. у 1969 г. Пятроўская А. у в. Малая Воля Дзятлаўскага р-на ад Карэнкі Яўгеніі Сцяпанаўны, 1900 г.н.

7 АІМЭФ: зап. у 2016 г. Валодзіна Т. у в. Леніна (раней Гніліца) Слаўгарадскага р-на Магілёўскай вобл. ад Емельянавай Аляксандры Данілаўны, 1934 г.н. Какаты – дыялектная назва сукоў на дрэве.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 04/12/2025 23:33:48



Як ужо неаднаразова дэманстравалася ў навуковай літаратуры, усходнеславянскія замовы пераналі шэраг заходнееўрапейскіх матываў. Ужо добра даказаная агульная сюжэтная прастора, што аб'ядноўвае ўсходніх і заходніх славян з балтамі, хоць адрозненняў у балтыйскай і славянскай традыцый больш, чым падабенстваў (Zav'âlova, 2006). Таццяна Агапкіна вызначае наступныя крытэрыі для ўстанаўлення усходне- і заходнеславянскіх адпаведнікаў: большай часткаю гэта складаныя наратыўныя сюжэты, якія ўпэўнена ідэнтыфікуюцца пры параўнанні запісаў з розных традыцый; замовы з гэтымі сюжэтамі захоўваюць тую ж функцыю (матыў трох ружаў уваходзіць у замовы ад рожы) і прадстаўлены сукупнасцю варыянтаў па-за межамі паўночнарускай традыцыі, не фіксуюцца яны і на Балканах, але папулярныя ў германскіх народаў (Agapkina, 2010, s. 658–659). Ужо добра апісана функцыянаванне ў беларусаў шэрагу заходнееўрапейскіх сюжэтаў і матываў, сярод якіх сюжэт 1-га Мерзебургскага заклінання; матывы „Ішоў Хрыстос (іншы хрысціянскі персанаж), нёс тры ружы"; „Стой кроў у ране, як Хрыстос/вада ў Ярдані"; звароты да дрэваў пры болю зубоў, да Месяца з просьбай ачысціць цела/даць здароўе і інш. У дадзеным выпадку істотна заўважыць тое, што для Заходняй Беларусі менавіта яны – самыя распаўсюджаныя і дамінантныя ў адпаведных функцыянальных групах.

Да ліку беларуска-польскіх паралеляў, якія ўваходзяць у больш шырокую еўрапейскую прастору, з упэўненасцю можна аднесці і наступныя:

1. Матыў паслядоўнага вывядзення хваробы з частак цела распаўсюджаны шырока ў Еўропе і за яе межамі, вядомы са стараіндыйскіх і вавілонскіх тэкстаў, сустракаецца ў зборы Марцэлюса, як схема выкарыстоўваецца для шматлікіх сярэднявечных і больш позніх замоў. У беларускіх замовах гэты матыў характэрны перш за ўсё для жывёлагадоўчай магіі, а тэксты дэманструюць характэрнае для беларускай традыцыі імкненне да дэталізацыі, удакладненняў, павольнага і паслядоўнага пералічэння. А вось у палякаў і немцаў матыў зафіксаваны і для лекавання чалавека, прычым пры розных хваробах, гл. тут пры рожы: *Rozo... wylez z głowy – w piersi, z piersi – w brzuch, z brzucha – w kosci, z kosci – w golenie, z goleni – w stopy, z stop – w palce, z palcy – na sto lokci w ziemie* (Czernik, 1985, s. 94).
2. Зварот да дзіванны пры выгнанні чарвякоў з раны, перш за ўсё ў жывёлы. Да сонца зрываюць верхавінку дзіванны, потым прыціскаюць яе да зямлі каменем, каб і хвароба гэтак жа сталася прыціснутай: *Dziewanno, panno! póty cię stąd nie wypijszczę, dopóki robaki ryżej cielicy (czarnej krowy itp.) nie opuszczą* (Biegeleisen, 1929, s. 51). Цалкам тоесныя тэксты шырока фіксуюцца на ўкраінскай, рускай, літоўскай, нямецкай мовах. Пашырэнню іх на нямецкай і часткова польскай тэрыторыях усяляк садзейнічала перадрукоўка ў зборнічках магічных парадаў „Romanusbüchlein", „Egyptischen Geheimnissen" (Spamer, 1958, s. 391). Шмат фіксацый і ў беларусаў, але гэтаксама часцей на захадзе. Акрамя дзіванны, у такіх рытуалах сустракаюцца чартапалох, асот.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 04/12/2025 23:33:48



3. Лекаванне сухотоў у дзіцяці. Замоўных тэкстаў пры лекаванні рахітычных захворванняў і туберкулёзу ў дзіцяці зафіксавана няшмат. У абсалютнай большасці гэта заклінальныя прыгаворы ў складзе рытуала. У беларусаў і палякаў вербальнае суправаджэнне лекавання сухотаў (рахіту) вылучае рытуалы з семантыкай другога нараджэння, прыкладам, рытуал-дыялог пры «перапяканні». У асобных раёнах Польшчы хваробу не толькі перапякалі, але і „варылі”: у Чэнстахове на распаленыя вуглі лілі ваду з запаранымі зёлкамі, а над параю трымалі дзіця: – *Co tam robicie? – Suchocisko warzyty* (Biegeleisen, 1927, s. 355). У беларусаў рытуальная „варка” сустракаецца падкрэслена пры лекаванні начніц: *Што ву робіце? – Варым крыксы. – Варыце горш, каб не варылі больш* (Tolstoj, 2003, s. 374).

Калі рытуал-дыялог пры падобных рытуалах шырока бытаваў у Еўропе, разгорнуты зварот да пэўнай істоты/прадмета з просьбаю дадаць мяса на косці характэрны для беларуска-ўкраінска-польскай тэрыторыі. Замоўная вобразнасць разгортваецца на проціпастаўленні голых касцей і жаданага мяса. „Калі стала зразумелым, што дзіця «ў сушчах», маці нясе яго пасля заходу сонца да першага за вёскаю крыжа, кладзе ля падножжа і тройчы гаворыць: *Крыжу мілосці! Дай цела на косці! А не дасі цела на косці — Просім і да сваей мілосці!”* (Nikiforovskij, 1897, s. 39). Менавіта матыў звароту па «мяса» (= здароўе) да Бога і святых дамінуе ў польскай заклінальнай практыцы: *O Jezu z wysokości, włóż ciała na te kości, jak nie włożysz ciała na te kości, to je weź do swojej wieczności* (Paluch, 1994, s. 197).

Да часоў індаеўрапейскай еднасці адносіцца сюжэт *сустрэчы*, які праз вякі захаваў даволі стабільную будову тэкстаў. Сітуацыя абмену рэплікамі атрымала назву матыва „роўных ведаў” (Куды ідзеш? – Іду лячыць): адзін з персанажаў задае пытанне пра мэту падарожжа, другі паведамляе, што ідзе кагосьці лячыць, у адказ на што першы, як правіла, з больш высокім статусам, ухваляе яго дзеянні. Вядуць дыялог пары сакральных персанажаў, з выразнай іерархіяй, якую, безумоўна, ачольваюць Ісус Хрыстос і Божая Маці, у ліку сустрэчных у беларусаў – святыя, нават сонцавы дочкі, бабка і г.д. або сам шаптун.

> Святая госпожа богородице и святый чудотворца Козьма и Дамиан, станьте на помочи, и но аз, грешный, примовляю, но ты, госпоже, и размовляешь и распловляешь. Сошла святая богородица со небесе, // пошла по золотому мосту, и зстретит еи Иисус Христос, и рек еи: дай ми? И идешь? Иду раба божиа измовляти (*Redkie istočniki*, 1977, s. 110).

Гэта адзін з нямногіх рукапісных старабеларускіх тэкстаў, і ён арганізаваны паводле сюжэту сустрэчы. Аднак у наступныя стагоддзі сюжэт нават у дэталях даволі папулярны ў беларускіх замовах ад рознага роду немачаў. Значную колькасць тэкстаў прапануе польская традыцыя, а вось у цэнтральнай і заходняй Расіі і тым больш на поўначы матыў амаль невядомы, у заходніх і балканскіх славян сустракаецца ў складзе рукапісных малітваў. На карысць даўніны сюжэта сведчыць частая нематываванасць дыялогу сакральных персанажаў.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 04/12/2025 23:33:48



Сярод лекавальных тэксты з сюжэтам сустрэчы і формулай парады ў беларусаў сустракаецца толькі на заходнім памежжы:

Ішла Матка Боская праз густы лес. Спаткаўся Пан Езус і пытаецца:

– Куды ідзеш, Матка Боская?
– Іду праз тры дрэвы замаўляць урокі.
– Ідзі, замаўляй, памагай, помашчы божай з анёламі. Аман – 3 р.[8]

Яшчэ больш старажытны, на думку даследчыкаў, той варыянт сюжэту, калі дыялог адбываецца між памочнікам і самой хваробай, дэманам хваробы. У польскай традыцыі гэты матыў даволі папулярны і стэрэатыпны ў сваёй арганізацыі:

Szła Bolączka z Bolęcina, napotkał ją święty Józef:
– Dokąd idziesz, Bolączka?
– Idę kości łupać, krwią rozlewać.
– Żebyś się rozchodziła po grzesznym ciele, jak aniele po kościele (Grabowski, 1896, s. 129).

У беларусаў сюжэт сустрэчы менавіта з хваробай ужо вельмі рэдкі:

Ішоў Гасподзь дарогаю, рожа другою, сустракаецца Гасподзь і з рожаю.
– Куда ты, рожа, ідзеш?
– Я рожа, я іду к Ганне, кроў яе разбаўляць, цела яе раздуваць.
– Ідзі, рожа, у чыстае поле, де вецер не вее, дзе сонца не грэе, дзе пташкі не залятаюць. Там табе столікі засціланы, там табе кубачкі наліваны. Там табе есць піць і есці і мякка спаць[9].

Пералік падобных ці нават ідэнтычных рэалізацый еўрапейскіх матываў і сюжэтных схем у беларусаў і палякаў можна яшчэ працягваць. Але важна пазначыць і колькі прыкладаў, якія аб’ядноўваюць менавіта польскую і заходнебеларускую традыцыі**.**

## Паралелі на беларуска-польскім памежжы

Франтальны агляд замоўных корпусаў суседніх традыцый выяўляе шэраг супадзенняў, якія, між тым, невядомыя або рэдкія на ўсходзе Беларусі[10]. Адным

8 АІМЭФ: зап. у 1969 г. Давідовіч І. у в. Яцыны Астравецкага р-на Гродзенскай вобл. ад Бараноўскай Сабіны Міхайлаўны, 57 гадоў.

9 АІМЭФ: зап. у 2019 г. Валодзіна Т. у г. Глуск Магілёўскай вобл. ад Жарнаклёвай Анастасіі Сямёнаўны, 1931 г.н.

10 Маючы на ўвазе той факт, што актыўныя міграцыі другой паловы XX ст. і распаўсюд друкаваных зборнікаў замоў на мяжы тысячагоддзяў прывёў да перамяшання спрадвечных і запазычаных тэкстаў у розных кутках краіны.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 04/12/2025 23:33:48



з маркёраў заходнебеларускіх замоў выступае формула „адзін сурочыў, утрох адрабляюць" (гл. з Воранаўскага р-на: *Адзін чалавек урок, а тры адракуць: Буг Ойцец, Буг сын Божы і Буг дух свенты*), фіксаваная і ў іншых раёнах этнічнай тэрыторыі беларусаў, дзе, аднак, сустракаецца са значна меншай шчыльнасцю і ўваходзіць у разгорнутыя тэксты. У польскай традыцыі гэтая формула вядомая ў розных частках краіны і з нязначнай варыянтнасцю: *W Imię Ojca i Syna i Ducha* św. *Amen. Jeden cie urzykł, trzech cie odrzyka: Bóg Ojciec, Syn Boży, Duch św.* (Cisek, 1889, rozdz. III, s. 70, № 66). Фіксаванасць формулы далей у Заходняй Еўропе прымушае задумацца пра яе паходжанне і шляхі распаўсюджання. Самая старая ўзгадка ў нямецкамоўных тэкстах датуецца XIV ст. (Schönbach, 1880, s. 69). Шмат варыянтаў паходзіць з памежных раёнаў Літвы, прычым як на беларускай, так і на польскай і літоўскай мовах.

На ўзроўні замоўнай вобразнасці вылучаюцца адзінкі: тры зорачкі з пералічэннем іх асаблівасцяў: *Zorzyczki, zorzyczki, trzy was jest – Цудоўныя зоркі на небе: адна ясная, другая красная, трэцяя (імя). Амінь* (Vasìlevìč i Salavej, 2009, s. 177, № 797); ахвяраванне 77 ліхаманкам: „От шыхли зварыты яйцэ и нэсты на пэрэкрэст дориг. Кынуты и сказаты: *Шыхля, вас сэмдисят сим, натэ сниданне всим*"[11] – пол. „Chory je na czczo 77 ziarenek surowego grochu i mówi: *Je was siemdesit i sim, naj wam bude na śnidanie wsim*" (Kolberg, 1963, s. 171); ячмень/пшаніца ў дыялогах пры ячменю: Каб ячмень з вока сышоў, калі хто спытае: *Што то - ячмень?* альбо *У цябе ячмень?*, трэба без развагаў адказаць: *Лжэш, прароку, пшаніца на воку!* (Federowski, 1887, s. 389, № 2365) і інш.

Больш у разгорнутыя сюжэтныя формы ўкладаецца матыў *Хадзіў сакральны персанаж і не баяўся, так і ты не бойся*: *Najświętsza Panno, / Ty, święta Anno! / Chodziłaś po górach, / Po lasach, / Nie bałaś się niczego – I ty się nie bój, Stanisławie!* (Kotula 1976, s. 199–200) і *Хадзіў Гасподзь па зямле і па вадзе і па ўсякай моцы і не баяўся суроцы, уроку, улёку і прыгавору, ні пужання, ні ўлякання. І ты, раб божы, ня бойся ні ўроку, ні ўлёку* (Замовы, 1992, № 974). Блізкі і сюжэт „*Ішоў Хрыстос цераз лес, не ўкусіў яго ніякі пес, каб не ўкусіў і мяне*" – гэтаксама сюжэт-маркер заходнебеларускіх і польскіх замоў. Наогул, апеляцыя да жыццёвага шляху Хрыста, натуральна, складаючы аснову народных малітваў, мае і выразныя сюжэтаўтваральныя і важкія семантычныя функцыі ў шэрагу замоў, бо адсылка да прэцэдэнту адным сваім фактам магічна забяспечвае дзейснасць і выніковасць замаўлення.

Ішла Божа Маці ўдар адымаці ад белага цела, ад белай касці, ад чырвонай крыві. Двох адымае, трэці памагае, а Божая Маці малітву замаўляе. Госпадзі, прымі маю малітву да святое раны. Хрыстос радзіўся, хрысціўся на Вердані[12].

---

[11] Беларускі-фальклорна этналінгвістычны атлас (архіў Інстытута мовазнаўства НАН Беларусі: зап. Махонь С.В. у в. Засімы Кобрынскага р-на Брэсцкай вобл.).

[12] АІМЭФ: зап. у 1965 г. Юшкевіч Д.І. у в. Пасінічы Слонімскага р-на Гродзенскай вобл. ад Валюк Марыі Васільеўны, 55 гадоў, непісьм.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 04/12/2025 23:33:48



> Pana Chrystusa prorokowano w Nazarecie, vrodził sie w Betleiem, vkrzyzowan w Jeruzalem – jako to prawda, tak ta krew niech sie zastanowi (Lud, 1899, s. 80).

Для заходнебеларускіх замоў, запісаных у бальшыні выпадкаў ад католікаў, сігнальным можна назваць зачын „Божа Маці по садочку / небу / касцёлу ходзіць, сыночка за ручку водзіць”. У замовах ад розных функцыянальных груп дапаўняецца адпаведна спецыялізацыі :

> У нядзелю рана сонейко ўзыходзіць, Найсвенча Матка па цэркві ходзіць, свайго сыночка за ручку водзіць. Ішла, на камень ступіла, слядок зрабіла, (імя) каўтун на месца паставіла. Хваціць табе, каўтуне, хадзіць…( Vasìlevìč i Salavej, 2009, s. 277, № 1277, Карэліц.); Найсвеншая Матка па небу хадзіла, свайго сыночка за ручку вадзіла. Вольгачку мамка радзіла, залатушачку пасадзіла. Ад духа серца, ад духа серца, Пан Езус у гробе, а серца ў тобе[13].

Тое ж і ў польскай традыцыі: *Soneczko schodyt', naświetsza Panna do dworu chodyt', swoho Syna błahaje, sczystuju slozu zamawlaje, czorneje belmo naświetszym swoim wołosiom steraje* (Kolberg, 1964, s. 207).

Аднак колькасна пераважаюць тэксты, дзе апавядаецца пра падарожжа Божай Маці з Сынам з розных набажэнстваў на мора: *В ныділю рано сонычко ходыть, Божа Матер сыночка за ручку водыть. Повыла ёго на коганэць, з коганыці на поміну, з поміны на сыне морэ…* (Valodzìna, 2009, s. 651, Маларыц.). Менавіта такая рэалізацыя сюжэту ўласцівая польскім тэкстам, якія маюць назву народных малітваў і прамаўляюцца перадусім у прафілактычных мэтах: перад сном, перад дарогай і пад.

> W niedziele rano suonecko schodzi, naświętsa Paninka Synacka wodzi. Zawiedua go na jucznią, z Juczm na ranną msą, z ranny msy na wielgą msą, z wielgi msy na kazanie, a z kazania do raju. A w tym raju kamiń puywa, gdzie Pan Jezus uodpocywa. Wszyćkie panny zasnęuy, ino jedna nie spaua: Siedzi sobie na suonecku, trzyma książkę na uonecku. Do kościoua biegali, janieli śpiwali…(Udziela, 1889, s. 594–595).

## Паралелі па-за кантактнымі зонамі

У цэлым арэальнае даследаванне беларускіх замоў у параўнанні з польскімі выявіла цікавую карціну, якая дэманструе адметныя супадзенні па-за суседнімі тэрыторыямі. Адна і тая ж формула з даволі высокай ступенню шчыльнасці

13 АІМЭФ: зап. у 1976 г. Барташэвіч Г.А. у в. Ассё Лепельскага р-на Віцебскай вобл. ад Сазон Н.М., 78 г.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 04/12/2025 23:33:48



можа фіксавацца далёка ад зоны памежжа. У той жа час уласна прыгранічныя беларускія раёны дэманструюць іншую і наогул самадастатковую замоўную сістэму. Акрамя шэрагу прыватных вобразных паралеляў, кшталту звароту да кутоў/вуглоў пры лекаванні начніц *Kątku, kątku, przywroc spanie mojemu dzieciątku* (Kotula, 1976, s. 183) і *Куточки-браточки, возьмите от того младенца ночнички да нашлите на его сонички* (Agapkina, 2003, № 51, Гомел.), вылучаюцца і даволі буйныя комплексы, цэлыя функцыянальныя групы, вербальна распрацаваныя ў палякаў і на беларускім Падняпроўі пры тым, што ў Заходняй Беларусі не зафіксавана ніводнага тэксту. Да іх ліку адносяцца, прыкладам, замовы ад бяльма, жабкі, шалу (wścieklizny) і, часткова, ад залатніка.

Цэнтральны сюжэт беларускіх, амаль выключна падняпроўскіх, замоў ад бяльма можна прадставіць наступным чынам: «Сьвяты Юры / інш. ехаў верхам / ішоў, за ім беглі тры сабакі (харты, ваўкі, валы, інш.) – чорны, белы і чырвоны (шэры); трэці ці ўсе трое здымалі / злізвалі / зганялі бяльмо». З прасоўваннем на захад беларускія і ўкраінскія памочнікі-харты саступаюць месца іншым персанажам, перш за ўсё святым асобам, хоць і ў беларусаў у адзінкавых выпадках Ісуса Хрыста суправаджаюць трое святых (выконваючы дзеянні, традыцыйна замацаваныя за жывёламі-памочнікамі):

> Першым разам, добрым часам Госпаду Богу памалюся, Прачыстай Мацеры пакланюся. Ішоў сам Гасподзь і вёў за сабой трох ангелаў-архангелаў Пятра, Паўла і Іллю. Пятро слізае, а Павел бельмы зганяе, а Ілля вочы ачышчае (Vârgeenka, 2009, s. 49).

Дадзеныя з розных этнічных традыцый пераканаўча сведчыць пра тое, што ў замовах гэтай функцыянальнай групы дамінуе матыў шляху. У заходніх славян, дзе гэты матыў з’яўляецца стваральным у дадзенай групе, у якасці аднаго з вандроўнікаў называецца сама хвароба, якая яшчэ толькі збіраецца да хворага і яе дзеянні можна яшчэ прадухіліць, хваробу можна ўгаварыць, каб яна нічога не прадпрымала: *Sedł pan Jezus z Najświętsą Panną drózką / Spotkał się z rysim pazurem i łuscką, / „Kaj ty idzies rysi pazurze i łuscko?” / – Idę ludziom ocy zasłaniać* (Siarkowski, 1879, rozdz. III, s. 54). Акрамя Ісуса Хрыста з Божай Маці ўзгадваюцца святыя Разалія, Атылія і Сюзанна, якія сустракаюцца з імі і паведамляюць пра свой намер дапамагчы пакутніку. Магчыма, перавага ідэі шляху ўзмацняецца і сімволікай уласна вока, калі орган зроку ўспрымаецца як канал, дарога для перамяшчэння інфармацыі з чыста візуальнага плана ў план зместу.

У заходніх славян матыў *трох падарожных дзеваў* адносіцца да ліку асабліва папулярных, ва ўсходніх – персанажы-памочніцы часцей змяшчаюцца ў сакральны цэнтр. У польскіх, а таксама чэшскіх замовах жаночыя персанажы-памагатыя занятыя пераважна рукадзеллем, а трэцяя з іх дапамагае ад хваробы: *Św. Kasylda trzy córeczki miała: / Jedna śwacka, / Druga pracka, / Trzecia nic nie robiła, / Ino łuscke żegnała, / Żeby oka nie popsuła / Kości nie połamała* (Ciszewski, 1887, rozdz. III, s. 55). Калі ж звярнуць увагу на нямецкае суседства, то і там,

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 04/12/2025 23:33:48



пачынаючы з XVI–XVII стст. матыў трох паннаў пераважае, прычым у розных частках краіны. Як правіла, гэтыя панны не маюць імя, дзеянні дзвюх з іх накіраваны на замятанне, зрыванне, прыбіранне лістоты, травы, пылу і г.д., што магічна апраўдана і папярэднічае дзеянням трэцяй, якая лечыць ад канкрэтных недамаганняў, да прыкладу, ад бяльма ў воку:

> Es gingen 3 heilige Mägde übern Weg, die erste schüttet Sand in den Weg, die zweite pflückt Gras aus der Weg, die dritte nimmt den Fluß aus Kopf und Augen weg (Ernst, 2011, s. 188, Мекленбург) – Ішлі тры святыя дзевы дарогаю, адна сыпала пясок на дарогу, другая рвала траву з дарогі, трэцяя зняла Fluß з галавы і вачэй.

Менавіта такой прыродна-ачышчальнай дзейнасцю ў магічным імкненні да вызвалення ад хваробы займаюцца тры паненкі ў замовах у зоне панямонска-заходнепалескага памежжа:

> Па небе ішлі тры панны, *адна ваду адлівае, другая траўку адкідае*, трэця ад … урокі адганяе. Святыя мошчы, станьця ў помашчы[14]; Стаяла цэркаў, у цэрквачцы тры сястрычкі: *адна пясочак сыпле, другая вадзічку лье, трэцця траўку шаўкову шчыпала*, падумы жэнскія, мужскія (імя) знімала[15].

Такім чынам, у шырокай прасторы нямецкамоўных замоў і іх бліжэйшых суседзяў тры жаночыя персанажы дапамагаюць хвораму ўсе разам або толькі трэцяя з іх. Сферы дзейнасці гэтых гераінь даволі разнастайныя, тэма ткацтва, хоць і прадстаўленая досыць шырока, дамінуе ў польскіх і вельмі шырока пашырана ў беларускіх замовах. Але што цікава – не зафіксаваная на памежжы. Замовы Заходняй Беларусі працягваюць нямецкую тэматыку і вобразнасць, як бы пераскочыўшы праз польскую тэрыторыю.

Цікава супаставіць і іерархічныя дачыненні жаночых персанажаў у замовах. Заходнееўрапейская традыцыя, як правіла, не вылучае верхавенства, пазначыўшы ўсіх траіх як дзеваў, Марый або кожнай з іх надаўшы свае здольнасці ў лекаванні хваробы. Бліжэйшая да нас польская традыцыя сюжэт трох жаночых персанажаў увасабляе ў вобраз трох дачок святой, апошняя з якіх дапамагае ў лекаванні: *Święta Otylija, trzy córki miała: Jedna prządła*, *Druga motała*, *A trzecia urok świętym odczyniała* (Biegeleisen, 1929, s. 243). У беларусаў у замовах вельмі рэдка выступае інфармацыя пра „бацькоў” сясцёр, тым не меншназіраецца створаны падобным чынам вобраз Найсвеншай / Прачыстай

---

[14] Архіў вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору БДУ (АВНЛ): зап у 1989 г. Малотка Т. у в. Добры Бор Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл. ад Журко Марыі Мікалаеўны, 1936 г.н.

[15] АВНЛ: зап. у 1998 г. Яфімава В. у в. Сялец Івацэвіцкага р-на Брэсцкай вобл. ад Папко Аляксандры Сцяпанаўны, 1925 г.н.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 04/12/2025 23:33:48



Маці: *У Найсвеншай Маткі было тры дачушкі: Палагея, Анастасея, Аўдакея. Палагея рану замаўляла, Анастасея жгала вынімала, Аўдакея краску ўнімала* (Vasìlevìč i Salavej, 2009, s. 144, № 624).

У польскіх замовах распрацаваны матыў *стрэлу* і нават наяўныя найменні сярод наменклатуры хваробаў, матываваных адчуваннем стрэлу/вострай раны: *postrzál, zastrzał*. Замовы адпаведнай функцыянальнай групы абапіраюцца на схему сустрэчы і дыялога, калі ўласна хвароба сустракаецца на сваім шляху з Панам Езусам і непасрэдна мовіць аб сваім намеры гвалтаваць хворага, тым самым падкрэсліваецца ўніверсальнаядэталь: страляць у хворае месца:

> Poszedł zastrzał ze swoją zastrzałową, / Ze swojem siedmiorgiem dzieci. / Napotkał go tam Pan Jezus z nieba. / (Pan Jezus) - Gdzie ty idziesz zastrzale? / (Zastrzał) – Idę na jego (chorego dziecka) imieniny, / Będę strzelał w jego żyły. / (Pan Jezus) – Nie chodź-że tam zastrzale, / Bo ja ci tam nie każę. / Idźże ty w olszynę, grabinę, / W sośninę, wszelaką drzewinę. / Będzie ci sam Pan Jezus mocą, / Najświętsza Panna dopomocą (Biegeleisen, 1929, s. 222).

Украінская і руская традыцыі ў замовах гэтай функцыянальнай групы аддаюць перавагу не дыялагічнай форме, але наратывам. А беларусы, якія фактычна не маюць у складзе свайго замоўнага кампендыума хваробаў з назвамі, абумоўленымі матывам стрэлу, гэтым самым амаль выключылі дадзены матыў з комплексу вербальнай магіі, увасобіўшы ўніверсальную для еўрапейскай (і шырэй) прасторы ідэю адстрэльвання хваробы ў арыгінальным блоку замоў ад звіху/удару, якія будуюцца па ўзоры рытуалу-дыялога і транслююць схему сустрэчы хваробы з сакральным персанажам на іх шляху.

> Шла Найсвенша Панна Марыя, удар … одговорала. Судочыла сыночка, стала ёго пытаты:
> – Куда ідэш, сынок?
> – Соколі стрэляты.
> – Да нэ бі, сыночку, у голывочку, да бі ў суставы, штоб усі суставы да на місты осталі. От хвілі до хвілі, штоб сталі ўсі суставы на міры (Valodzìna, 2009, s. 641, Іванаўск.).

Заканамерным выглядае факт, што польская замоўная сюжэтыка працягнула і творча распрацавала нямецкую тэматычна-вобразную разнастайнасць. Заўважна вылучаецца матыў *Шчаслівая гадзіна нараджэння Хрыста, каб была спрыяльнай і гадзіна лекавання*:

> Sceśliwa była godzina kiedy Najświętsa Panna porodziła syna, Zeby taka była sceśliwa godzina kiedy będę te róze (…) *zazegnywac* (Siarkowski, 1879, rozdz. III, s. 56). Szcześliwa ta godzina była, kiedy Najświetsza Maryja Panna Jezusa Chrystusa rodziła; niechże i ta bedzie szcześliwa, któro ja cie boleśnie wymawiam …. (Dąbrowska, 1902, s. 427).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 04/12/2025 23:33:48



У беларусаў па-за зонай памежжа, сярод праваслаўных запісаны тэксты з акцэнтам на шчаслівай мінуце Божага нараджэння і, адпаведна, вясёлым дні. Паказальны ў гэтым кантэксце формульны зачын з замовы з Бярэзінскага р-на: *Шчаслівая тая мінутачка, у якую Ісус Хрыстос нарадзіўся* (Vasìlevìč, Salavej, 2009, s. 48, № 104); *Як Ісус Хрыстос нарадзіўся, увесь свет вазвесяліўся, ахрысціўся і ўзрадаваўся. Так тожа раба Божая (імя) ахрысцілася і ўзрадавалася і злому чалавеку не паддавалася* (Vasìlevìč i Salavej, 2009, s. 190, № 864).

## Сюжэтна-матыўны склад заходнебеларускіх замоў

Узровень сабранасці і даследаванасці замоў заходняй часткі краіны яшчэ не дазваляе дастаткова дакладна правесці мяжу па тэрыторыі Беларусі, што аддзяляла б яе ад усходняй; пэўным арыенцірам можа служыць граніца, што існавала да 1939 г. Аднак, культурныя межы далёка не абавязкова і не заўсёды супадаюць ці нават перасякаюцца з палітычнымі і дзяржаўнымі межамі. Адным з крытэрыяў можа быць шчыльнасць пражывання каталіцкага насельніцтва, аднак і ў праваслаўных замовах на гэтай зямлі ў большыні выпадкаў назіраюцца тыя ж самыя рысы.

Пры тэндэнцыі да заклінальнага, часта формульнага характару тэкстаў, невялікую долю складаюць нарэтыўныя замовы. Сюжэтны тып міфалагічнага цэнтру тут рэдкі, магчыма, позні, у параўнанні з замовамі з суседніх рэгіёнаў Беларусі лапідарны, падзейнасць жа забяспечваецца матывам шляху сакральнага персанажа. У эпічных сюжэтах з тэмай шляху перамяшчэнне персанажа падаецца з мінімальным апісаннем прасторы, на фоне якой адбываюцца падзеі. У замовах пераважна каталіцкага насельніцтва гэты матыў шляху рэалізуецца ў паэтычным зачыне „У нядзелю рана ясна сонца ўсходзіць/не ўсхадзіла, Божая Матачка па касцёлу хадзіла”.

Менавіта захад краіны і перш за ўсё каталіцкія раёны паказальны зваротам да сюжэтаў Святога Пісьма і да вобразаў Ісуса Хрыста, хоць і ў народным, нярэдка па-свойму патлумачаным варыянце: *Ісус Хрыстос цярпеў і крыві астанавіцца вялеў* (Vasìlevìč i Salavej, 2009, s. 375, № 1791, Зэльв.).

Замоўныя рэпертуары вясковых шаптух, як правіла, уключаюць тэксты ад урокаў і пярэпалаху, рожы і звіху, крывацёку і зубнога болю, лішаю і ўкусу змяі. Гэтая функцыянальная канстанта, натуральна, можа дапаўняцца тэкстамі ад галаўнога болю ці грызі, ураза або не ўключаць ніякіх іншых замоў , але гэты „знахарскі мінімум” пацвярджаецца і экспедыцыямі апошняга часу. І ў саміх замовах ад той ці іншай хваробы заўважна вылучаюцца сюжэтна-матыўныя прыярытэты, якія пераважаюць з вялікім адрывам. Тэксты з шырокай зоны памежжа маюць вялікую колькасць дакладных адпаведнікаў з заходнееўрапейскімі эквівалентамі, а таксама выяўляюць моцны заклінальны характар. На беларуска-польскім памежжы замовы часта ўключаюць дыялог, што працягвае гэты характэрны для польскай традыцыі сюжэтны ход.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 04/12/2025 23:33:48



## Высновы

Даследаванне актуалізавала вывучэнне духоўнай культуры Заходняй Беларусі ў цэлым і замоўна-заклінальнай традыцыі ў прыватнасці. Такая рэзкая неадпаведнасць у колькасці і сюжэтна-матыўнай шматстайнасці ў заходніх памежных раёнах і, напрыклад, Падняпроўі, асабліва Пасожжы, прымушае паразважаць над пытаннем аб тэмах, дэталях і дамінантах не толькі сферы народнай медыцыны, але і ў больш шырокай перспектыве – абстратэгіях і тактыках узаемадзеянняў з сакральным светам, структуры дачыненняў унутры соцыуму. Больш выразная і глыбокая ступень народнай рэлігійнасці заходнебеларускіх вяскоўцаў абумовіла пошук адпаведных шляхоў вырашэння канфліктных сітуацый. Насычанасць замоўных тэкстаў хрысціянскай сімволікай сведчыць аб высокім узроўні абазнанасці ў біблійнай літаратуры. Розныя, як этнічныя, так і канфесійныя, кантакты пакінулі свой след у замоўным рэпертуары і ў сістэме народнай медыцыны жыхароў Брэстчыны і Гродзеншчыны.

Праведзенае супастаўленне набліжае да апісання агульнага еўрапейскага фонду, звязанага з распаўсюджаннем і адаптаваннем хрысціянскіх матываў і вобразаў.

## REFERENCES / BIBLIOGRAFIA

**Sources / Źródła**

Balkuce, Ryta. (2020). Z belaruskìh èkspedycyj. *Belaruskì fal'klor: matèryâly ì dasledavannì*, 7, s. 361–370. [Балкуце, Рыта. (2020). З беларускіх экспедыцый. *Беларускі фальклор: матэрыялы і даследаванні*, 7, с. 361–370].

Bartašèvìč, Galìna. (1992). *Zamovy*. Mìnsk: Navuka ì tèhnìka. [Барташэвіч, Галіна. (1992). *Замовы*. Мінск: Навука і тэхніка].

Biegeleisen, Henryk. (1927). *Matka i dziecko w obrzędach, wierzeniach i zwyczajach ludu polskiego*. Lwów. Nakładem towarzystwa wydawniczego „Atheneum”.

Biegeleisen, Henryk. (1929). *Lecznictwo ludu polskiego*. Kraków: Polska Akademia Umiejetności.

Cisek**,** Marceli. (1889). Materyjaly etnograficzne z miasteczka Żołyni w powiecie przemyskim. *Zbiór Wiadomości do Antropologii Krajowej*, 13, rozdział III, s. 54–83.

Ciszewski, Stanisław. (1887). Lud rolniczo-górniczy z okolic Sławkowa w powiecie olkuskim. *Zbiór Wiadomości do Antropologii Krajowej*, 11, rozdział III, s. 1–129.

Czernik, Stanisław. (1985). *Trzy zorze dziewicze. Wśród zamawiań i zaklęć*. Łódź: Wydawnictwo Łódzkie.

Dąbrowska, Stanisława. (1902). Lecznictwo ludowe. *Wisła,* 16, s. 425–429.

Federowski, Michał. (1897). *Lud białoruski na Rusi Litewskiej. Materiały do etnografii słowiańskiej zgromadzone w latach 1877–1905: w 8 t*. T. 1. *Wiara, wierzenia i przesady z okolic Wolkowyska, Slonima, Lidy i Sokółki*. Kraków: Polska Akademia Umiejetności.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 04/12/2025 23:33:48



Grabowski, A. (1896). Lecznictwo ludowe. *Wisła*, 9, s. 129–130.

Kolberg, Oskar. (1963/1888). *Dzieła wszystkie*, t. 31. *Pokucie*, cz. III. Wrocław–Poznań: Polskie Towarzystwo Ludoznawcze.

Kolberg, Oskar. (1964/1891). *Dzieła wszystkie*, t. 34. *Chełmskie*, cz. II. Wrocław–Poznań: Polskie towarzystwo Ludoznawcze.

Kotula, Franciszek. (1976). *Znaki przeszłości. Odchodzące ślady zatrzymaćw pamięci*. Warszawa: Ludowa Spółdzielnia Wydawnicza.

Krček, Franciszek. (1899). Zamawiania chorób i.t.p. *Lud*, 5, s. 78–82.

Nikiforovskij, Nikolaj. (1897). *Prostonarodnye primety i pover'â, suevernye obrâdy i obyčai, legendarnye skazaniâ o licah i mestah*. Vitebsk: Gubern. tipolit. [Никифоровский, Николай. (1897). *Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах*. Витебск: Губерн. типолит.].

*Redkie istočniki po istorii Rossii*. (1977). Vyp. 1: *Drevnerusskij lečebnik*. Perevod s pol′skogo XVI v., spisok XVII v. Podg. k pečati Z.N. Bočkarevoj. M. AN SSSR. [*Редкие источники по истории России*. (1977). Вып. 1: *Древнерусский лечебник*. Перевод с польского XVI в., список XVII в. Подг. к печати З.Н. Бочкаревой. М. АН СССР].

Schönbach, A. E. (1880). Segen. *Zeitschrift für deutsches Altertum und deutsche Literatur*, 12, s. 65–82.

Siarkowski, Władysław. (1879). Materiały do etnografii ludu polskiego z okolic Kielc. *Zbiór Wiadomości do Antropologii Krajowej*, t. 3, s. 3–61.

Štèjner, Ìvan; Novak, Valâncìna. (1997). *Taâmnìcy zamoŭnaga slova*. Gomel′: BGTÌ. [Штэйнер, Іван; Новак, Валянціна. (1997). *Таямніцы замоўнага слова*. Гомель: БГТІ].

Töppen, Max. (1894). Wierzenia mazurskie *z dodatkiem, zawierającym klechdy i baśnie Mazurów*. Odbitka z t. VI „Wisły”. Warszawa: Druk Józefa Jeżyńskiego.

Udziela, Seweryn. (1889). Religia i modlitwa u ludu Ropczyckiego. *Wisła,* 3, s. 592–601.

Valodzìna, Taccâna. (2009). Malyâ žanry fal′kloru. Zamovy. U: *Tradycyjnaâ mastackaâ kul'tura belarusaŭ. U 6 t.* T. 4. *Brèsckae Palesse*. Kn. 2 (s. 599–654). Mìnsk. [Валодзіна, Таццяна. (2009). Малыя жанры фальклору. Замовы. У: *Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т*. Т. 4. *Брэсцкае Палессе*. Кн. 2 (с. 599–654). Мінск: Выш. шк.].

Vârgeenka, Svâtlana. (2009). *«Na mory-akìâne, na vostrave Buâne...» (lekavyâ zamovy Gomel'ščyny): fal'klorna-ètnagrafičny zbornìk*. Gomel′: GDU. [Вяргеенка, Святлана. (2009). *«На моры-акіяне, на востраве Буяне...» (лекавыя замовы Гомельшчыны): фальклорна-этнаграфічны зборнік*. Гомель: ГДУ].

Vasìlevìč, Uladzìmìr; Salavej, Lìâ. (2009). *Zamovy*. Mìnsk: „Belarus′”. [Васілевіч, Уладзімір; Салавей, Лія. (2009). *Замовы*. Мінск: „Беларусь”].

**Studies / Opracowania**

Agapkina, Tat′âna. (2003). *Polesskie zagovory (z zapisâh 1970–1990 gg.)*. Sost., podgotovka tekstovi komment. T.A. Agapkinoj, E.E. Levkievskoj, A.L. Toporkova. Moskva: Indrik. [Агапкина, Татьяна. (2003). *Полесские заговоры (з записях 1970–1990 гг.)*. Сост., подготовка текстови коммент. Т.А. Агапкиной, Е.Е. Левкиевской, А.Л. Топоркова. Москва: Индрик].

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 04/12/2025 23:33:48



Agapkina, Tat′âna. (2010). *Vostočnoslavânskie lečebnye zagovory v sravnitel'nom osveŝenii. Sûžetika i obraz mira*. Moskva: Indrik. [Агапкина, Татьяна. (2010). *Восточнославянские лечебные заговоры в сравнительном освещении. Сюжетика и образ мира*. Москва: Индрик].

Brückner, Aleksandr. (1895). Kazania średniowieczne, cz. 2. *Rozprawy Akademii Umiejętności. Wydział Filologiczny*, 24, s. 1–52.

Brzozowska-Krajka, Anna. (1995). Między magią a religią: o modlitewkach ludowych. W: Jerzy Bartmiński, Maria Jasińska-Wojtkowska (red.). *Folklor – sacrum* – religia (s. 183–200). Lublin: IEŚ–W.

Ernst, Wolfgang. (2011). *Beschwörungen und Segen. Angewandte Psychotherapie im Mittelalter*. Böhlau Köln.

Krzyżanowski, Julian (red.). (1965). *Słownik folkloru polskiego*. Warszawa: Wiedza Powszechna.

Leńczuk, Mariusz. (2017). Dwa staropolskie zaklęcia z XV w. *Studia Źródłoznawcze*, 55, s. 217–228.

Marczewska, Marzena. (2012). *Ja cię zamawiam, ja cię wypędzam… Choroba. Studium językowo-kulturowe*. Kielce: Wydawnictwo Uniwersytetu Jana Kochanowskiego.

Nebžegovskaâ-Bartminskaâ, Stanislava. (2005). Šla bolâčka s Bolentina… Konceptualizaciâ bolezni v pol′skom âzyke i v pol′skih narodnyh zagovorah. W: *Zagovornyj tekst. Genezis i struktura* (s. 309–325). Moskva: Indrik. [Небжеговская-Бартминская, Станислава. (2005). Шла болячка с Болентина… Концептуализация болезни в польском языке и в польских народных заговорах. В.: *Заговорный текст. Генезис и структура* (с. 309–325). Москва: Индрик].

Niebrzegowska-Bartmińska, Stanisława. (2007). *Wzorce tekstów ustnych w perspektywie etnolingwistycznej*. Lublin, Wydawnictwo Uniwersytetu Marii Curie-Skłodowskiej.

Paluch, Adam. (1994). Suchoty: przyczynek do ludowego pojęcia o chorobie, etiologii i terapii. W: Wojciech J. Burszta, Jerzy Damrosz (red.). *Pożegnanie paradygmatu? Etnologia wobec współczesności* (s. 192–201). Warszawa: Instytut kultury.

Spamer, Adolf. (1958). *Romanusbüchlein. Historisch-philologischer Kommentar zu einem deutschen Zauberbuch*. Berlin: Akademie-Verlag.

Tolstoj, Nikita. (2003). *Očerki slavânskogo âzyčestva*. Moskva: Indrik. [Толстой, Никита. (2003). *Очерки славянского язычества*. Москва: Индрик].

Wachcińska, Olga. (2013). *Polskie zamówienie ludowe. Tekst i kontekst*. Starogard Gdański: Agencja DB.

Zav′âlova, Mariâ. (2006). Balto-slavânskij zagovornyj tekst: lingvističeskij analiz i model′ mira. Moskva: Nauka. [Завьялова, Мария. (2006). *Балто-славянский заговорный текст: лингвистический анализ и модель мира*. Москва: Наука].

Zowczak, Magdalena. (2004). „Sen Matki Bożej" jako modlitwa ludowa na pograniczu kulturowym. W: Zbigniew Jasiewicz (red.). *Wschód w polskich badaniach etnologicznych i antropologicznych. Problematyka – badacze – znaczenie* (s. 123–132). Poznań: Biblioteka Telgte.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 04/12/2025 23:33:48



Zowczak, Magdalena. (2013). *Biblia ludowa: Interpretacje wątków biblijnych w kulturze ludowej*. Warszawa: Wydawnictwo Naukowe Uniwersytetu Mikołaja Kopernika.

SUBMITTED: 26.09.2020
ACCEPTED: 6.03.2021
PUBLISHED ONLINE: 12.12.2021

## ABOUT THE AUTHOR / O AUTORZE

**Tatsiana Valodzina / Таццяна Валодзіна** – Białoruś; Mińsk; Narodowa Akademia Nauk Białorusi; Centrum Badań nad Białoruską Kulturą, Językiem i Literaturą; Instytut Sztuki, Etnografii i Folkloru; dr hab., docent, spec.: folklorystyka, etnolingwistyka, zainteresowania naukowe: tradycyjna kultura duchowa Białorusinów i innych Słowian; język i kultura.

Adres: Цэнтр даследаванняў беларускай культуры НАНБ, вул. Сурганава 1, корп. 2, 220072, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь

Wybrane publikacje:

1. Valodzina, Tatsiana. (2018). The norm and its deviations in the context of childhood semiotics: the belarus tradition against the slavonic background. *Folklore. Elektronik Journal of Folklore*, 72, p. 89–110. [www.folklore.ee/folklore/vol72].
2. Лобач, Уладзімір; Валодзіна, Таццяна. (2016). *Святыя крыніцы Беларусі*. Мінск: Беларуская навука.
3. Валодзіна, Таццяна, Кухаронак, Таццяна. (2015). *„Ядраное жыта гаспадара кліча...”: каляндарны год у абрадах і звычаях*. Мінск: Беларуская навука.
4. Валодзіна, Таццяна. (2009). *Цела чалавека: слова, міф, рытуал*. Мінск: Тэхналогія.
5. Валодзіна, Таццяна. (1999). *Семантыка рэчаў у духоўнай спадчыне беларусаў*. Мінск: Тэхналогія.